22-23.11.2018 у ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» праходзіў **семінар-панарама педагагічнага вопыту** для метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, раённых (гарадскіх) вучэбна-метадычных кабінетаў, настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры **«Пазаўрочная дзейнасць вучняў як складнік эфектыўнага навучання беларускай мове і літаратуры»**. Вопытам рэалізацыі праектаў у пазаўрочнай дзенасці настаўніка з вучнямі і іх законнымі прадстаўнікамі падзяліліся настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА «Ждановіцкая сярэдняя школа» Мінскага раёна Чашун Рэгіна Генадзьеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» ДУА «Гімназія №8 г. Віцебска» Карасевіч Алена Міхайлаўна і прадстаўнікі ДУА «Гімназія № 14 г. Мінска»: Шукелойць Ірына Леанардаўна, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, Калода Кацярына Вячаславаўна, Хмяльніцкая Наталля Вікенцьеўна, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры. Вялікую ўвагу фальклору і этнапедагогіцы надалі Кніга Галіна Паўлаўна (ДУА «Гімназія г. Пружаны») і Пілько Вольга Аляксандраўна (ДУА «Ладзеніцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа» Навагрудскага раёна). Сістэму пазаўрочнай работы па прадмеце ва ўстанове адукацыі прадставілі дырэктар, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА «Гімназія № 2 г. Наваполацка» Лубінская Таццяна Фаілаўна і настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА «Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва» Храбрая Наталля Мікалаеўна. Мачэль Алена Лявонцьеўна (ДУА «Гімназія з беларускай мовай навучання № 23 г. Мінска») распавяла пра віртуальны квэст як від пазаўрочнай работы па беларускай мове і літаратуры. Магчымасцям сучаснай музейнай педагогікі прысвяціла сваё выступленне Пархімовіч Вольга Генадзьеўна, загадчык аддзела культурна-адукацыйнай работы Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Стварэнне і выкарыстанне медыйных матэрыялаў і электронных рэсурсаў стала тэмай даклада Селіфонтавай Людмілы Валер’еўны (ДУА «Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва»). Яўсеенка Ірына Віктараўна (ДУА «Рэчыцкі раённы ліцэй») падзялілася вопытам рэалізацыі тэкстацэнтрычнага падыходу ў пазаўрочнай дзейнасці па беларускай мове і літаратуры. Асаблівасці праектна-даследчай дзейнасці на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі акрэсліла Кандрашова Таццяна Юр’еўна (ДУА «Сярэдняя школа № 178 г. Мінска імя Т. А. Лук’яновіча»). З літаратурна-музычнымі пастаноўкамі пазнаёміла калег Панякова Ірына Іванаўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» ДУА «Гімназія № 56 г. Гомеля імя А. А. Вішнеўскага». Пра варыянты выкарыстання прыёмаў інтэлектуальных гульняў у пазаўрочнай дзейнасці па беларускай літаратуры расказала Шведава-Юніцкая Вольга Віктараўна (ДУА «Навасёлкаўскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа» Ашмянскага раёна). Кажура Віктар Віктаравіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА «Вілейская гімназія № 2», член грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», прапанаваў шляхі ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў 5-6 класаў. Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся са значнай

колькасцю метадычных прадуктаў і выказалі намер выкарыстоўваць эфектыўны вопыт калег у сваёй прафесійнай дзейнасці.

**_Акушэвіч А.А.,_**
_метадыст упраўлення вучэбна-метадычнай работы_
_ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі»_

